УДК 821.161.3



**Алена ШАРАПАВА**
*Старшы выкладчык кафедры "Гуманітарныя дысцыпліны" Беларуска-Расійскага універсітэта.*
*Сфера навуковых інтарэсаў: жанравыя мадыфікацыі ў беларускай літаратуры першай трэці XX ст., методыка выкладання беларускай літаратуры, беларуская дзіцячая літаратура.*
*Аўтар больш за 100 навуковых, навукова-метадычных і навукова-папулярных публікацый.*



**Вячаслаў КАРАТКЕВІЧ**
*Загадчык сектара суправаджэння нацыянальнага даследавання якасці адукацыі і міжнародных даследаванняў якасці адукацыі цэнтра ацэнкі якасці адукацыі, старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі гуманітарнай адукацыі Акадэміі адукацыі.*
*Сфера навуковых інтарэсаў: методыка выкладання беларускай літаратуры, развіццё літаратурнага працэсу, дзіцячая літаратура, ацэнка якасці адукацыі.*
*Аўтар больш за 150 навуковых, навукова-метадычных і навукова-папулярных публікацый.*

# "Хоць нямнога зрабіць, але каштоўнага…":

## развіццё ўніверсальных кампетэнцый у ходзе праектнай дзейнасці пры вывучэнні камедыі Кандрата Крапівы "Хто смяецца апошнім"

### Беларуская літаратура, X клас

**Ключавыя словы**: *Кандрат Крапіва, універсальныя і прадметныя кампетэнцыі, функцыянальная пісьменнасць, праектная дзейнасць, канферэнцыя*

З 2025 г. у Рэспубліцы Беларусь пачалі дзейнічаць адукацыйныя стандарты новага пакалення, якія адлюстроўваюць патрабаванні да дашкольнай, пачатковай, базавай і агульнай сярэдняй адукацыі. Работа над новымі стандартамі вялася ў адпаведнасці з Нацыянальнай стратэгіяй устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 г. і Канцэпцыяй развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2030 г. Навукова-метадалагічнай асновай стандартаў стаў праект Канцэпцыі фарміравання універсальных кампетэнцый дзяцей і вучнёўскай моладзі.

Гэтыя дакументы акцэнтуюць увагу на: 1) пераходзе "да новай парадыгмы адукацыі: вучэнне замест навучання" (тут і далей пераклад з рускай мовы аўтараў. — **Заўв. рэд.**) [1]; 2) запатрабаванасці ў адукаваных, маральных, прадпрымальных і кампетэнтных асобах, "*якія здольныя самастойна прымаць рашэнні ў сітуацыі выбару, прагназуючы іх магчымыя наступствы, і ўмеюць выбіраць спосабы супрацоўніцтва. Яны павінны вызначацца мабільнасцю, дынамізмам, канструктыўнасцю, валодаць развітым пачуццём адказнасці за свой лёс і лёс краіны*" [2]; 3) неабходнасці фарміравання не толькі прадметных, але і універсальных кампетэнцый, якія ўключаюць у сябе змест і сэнсы асобасных і метапрадметных кампетэнцый, а таксама функцыянальнай пісьменнасці.




*П'еса К.Крапівы "Хто смяецца апошнім" у экспазіцыі Музея беларускага кнігадрукавання Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Фота А.Корзюка.*

Да ўніверсальных кампетэнцый вучняў адносяцца: устойлівае асобаснае развіццё, мысленне, эмацыйная рэгуляцыя, камунікацыя, кааперацыя, грамадзянскасць. У нацыянальнай рамцы ўніверсальных кампетэнцый да кожнай з іх вылучаны змястоўныя аспекты і асноўныя прыкметы праяўлення, якія, у сваю чаргу, праецыруюцца на асобасны, лакальны і глабальны ўзроўні [3, с. 7].

Фарміраванне ўніверсальных кампетэнцый адбываецца на розных узроўнях і ступенях адукацыі. Аналіз вучэбных праграм, напрыклад, па беларускай літаратуры для X—XI класаў (базавы ўзровень), паказвае, як прадметныя кампетэнцыі суадносяцца з кампетэнцыямі ўніверсальнымі, становяцца іх своеасаблівай базай.

З гэтых прычын актуальным з'яўляецца пошук такіх метадаў навучання, якія б спрыялі фарміраванню як прадметных, так і ўніверсальных кампетэнцый. Адным з прадуктыўных нам бачыцца метад праектнай дзейнасці — *"спосаб дасягнення дыдактычнай мэты праз дэталёвую распрацоўку праблемы, якая павінна завяршыцца цалкам рэальным, адчувальным практычным вынікам, афармленым тым ці іншым чынам"* [4, с. 66].

У якасці прыкладу прапануецца алгарытм рэалізацыі праектнай методыкі пры вывучэнні ў X класе (базавы ўзровень) тэмы "*Кандрат Крапіва. Камедыя "Хто смяецца апошнім"*" [5, с. 11].

Асноўныя этапы работы над праектамі: 1) планаванне, 2) даследаванне (аналітычны этап), 3) вынікі і высновы (этап апрацоўкі інфармацыі), 4) прадстаўленне (прэзентацыя атрыманых вынікаў работы) і ацэнка вынікаў работы [5].

**ЭТАП І.** Праект з рабочай назвай *"Вучнёўская канферэнцыя, прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння Кандрата Крапівы"* мае практыка-арыентаваны характар і накіраваны на развіццё даследчых якасцяў навучэнцаў, навыкаў публічнага выступлення, умення працаваць у камандзе, а таксама пражываць пэўныя эмоцыі, што ў сукупнасці забяспечвае фарміраванне камунікацыі, кааперацыі, эмацыйнай рэгуляцыі і мыслення як ключавых універсальных кампетэнцый.

Настаўнік загадзя распрацоўвае план работы, вызначае колькасць дакладаў (не больш за чатыры), выступае ў ролі арганізатара, які дапамагае вучням працаваць у мініграпах над асобнымі модулямі праекта, правярае вынік работы, рыхтуе заданні для ацэнкі засвоенасці матэрыялу.

Мэта праекта — прадставіць вынікі засваення праграмнага матэрыялу па творчасці Кандрата Крапівы ў выглядзе выступлення з прэзентацыяй на вучнёўскай канферэнцыі.

Задачы:

1) асэнсаваць матэрыялы вучэбнага дапаможніка і іншых крыніц пра жыццё і творчасць пісьменніка;

2) ахарактарызаваць адлюстраваную ў камедыі "Хто смяецца апошнім" жыццёвую сітуацыю і вобразную сістэму ў катэксце гістарычнай эпохі;

3) сфарміраваць уяўленне пра сатырычную камедыю;

4) прааналізаваць асаблівасці сцэнічнага ўвасаблення п'есы.

**ЭТАП ІІ.** Аналітычна-даследчы этап арганізоўваецца па чатырох модулях у міні-групах навучэнцаў з улікам іх узроставых, псіхалагічных, творчых асаблівасцяў, вылучаюцца мадэратары. У групах размяркоўваюцца адказныя за кожны элемент прэзентацыі: даследчык, дызайнер, рэдактар, спікер і інш. Кожная міні-група на канферэнцыі выступае на працягу 5—7 хвілін.

*Модуль 1.* Група "Біёграфы" рыхтуе прэзентацыю *"Жыццё і творчасць Кандрата Крапівы"*, у якой адлюстраваны асноўныя этапы жыцця пісьменніка, тлумачыць зварот да пэўных літаратурных жанраў або відаў дзейнасці перыпетыямі яго лёсу і абставінамі часу. Яна павінна дапамагчы засвоіць новую і сістэматызаваць вядомую вучням інфармацыю (VIII клас: басня Кандрата Крапівы *"Дыпламаваны Баран"*, X клас: дзейнасць літаратурных аб'яднанняў *"Маладняк"*, *"Узвышша"*, *"Полымя"*, Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў, іх роля ў гісторыі айчыннага пісьменства). У прэзентацыі можна выкарыстаць фотаздымкі, урыўкі з дакументальных фільмаў. Па магчымасці рыхтуецца дайджэст відэаматэрыялаў і (або) літаратуразнаўчых крыніц па тэме.

*Модуль 2.* Група "Гісторыкі літаратуры" рыхтуе прэзентацыю пра гісторыю стварэння камедыі *"Хто смяецца апошнім"* з улікам характарыстыкі часу, у які п'еса была напісана і які адлюстроўвала. Таксама ў прэзентацыі неабходна прадставіць аналіз галоўных персанажаў п'есы па плане: пасада; адносіны да прафесійнай і навуковай дзейнасці; вызначальныя рысы характару; маўленчыя асаблівасці. Прыведзеныя звесткі ў якасці абагульнення можна паказаць на схеме або ў табліцы. Варыянтам прэзентацыі можа быць прадстаўленне галоўных герояў камедыі праз жанры афіцыйна-дзелавога стылю (аўтабіяграфію, рэзюмэ, характарыстыку і інш.).

*Модуль 3.* У сваёй прэзентацыі група "Літаратуразнаўцы" павінна, па-першае, даць азначэнне паняцця *"сатырычная камедыя"*, паказаць, якія асаблівасці камедыі Крапівы даюць падставы аднесці яе менавіта да гэтай жанравай разнавіднасці; па-другое, даць азначэнне паняцця *"канфлікт"*, паказаць яго рэалізацыю ў творы як паміж персанажамі, так і ў свядомасці асобных герояў. Для больш глыбокага разумення мэтазгодна параўнаць канфлікт сатырычнай камедыі Крапівы з канфліктам у камедыі *"Паўлінка"* Я.Купалы (VIII клас), фарсе-вадэвілі *"Пінская шляхта"* В.Дуніна-Марцінкевіча (IX клас), драме *"Раскіданае гняздо"* Я.Купалы (X клас), а таксама прааналізаваць прыёмы сатыры: гратэск, сарказм, выкарыстанне гаворачых прозвішчаў (Гарлахвацкі, Зёлкін, Чарнавус), даць характарыстыку маўленчых асаблівасцяў персанажаў як сродку стварэння камічнага эфекту.

*Модуль 4.* Група *"Мастацтвазнаўцы"* рыхтуе прэзентацыю пра кінематаграфічнае ўвасабленне камедыі Кандрата Крапівы. У ёй трэба даць інфармацыю агульнага характару: час стварэння фільма, рэжысёр, акцёры і інш.; мэтазгодна звярнуць увагу на рэжысёрскія змены ў параўнанні з арыгінальным тэкстам. Абавязкова трэба паказаць фрагменты з фільма, падрыхтаваць яго тызер ці трэйлер. Важным дадаткам да прэзентацыі можа стаць агляд тэатральных увасабленняў п'ес Крапівы.

**ЭТАП ІІІ.** На этапе апрацоўкі інфармацыі настаўнік кансультуе і кантралюе ход праектнай дзейнасці. Вучні сістэматызуюць неабходную інфармацыю, рыхтуюць канчатковыя варыянты прэзентацый.

**ЭТАП IV.** Пректы прэзентуюцца міні-групамі на першай з дзвюх гадзін, што адведзены на вывучэнне жыцця і творчасці Кандрата Крапівы. Настаўнік і іншыя вучні асэнсоўваюць іх і даюць першасныя ацэнкі.

Канчатковая ацэнка ступені засвоенасці праграмнага матэрыялу адбываецца на другой вучэбнай гадзіне. Для гэтага настаўнік прапаноўвае вучням сітуацыйную задачу, якая паказвае ўзровень асэнсавання навучэнцамі тэксту твора, а таксама адлюстроўвае вынікі фарміравання прадметных, асобасных і метапрадметных кампетэнцый (*гл. табліцу 1*).

*Табліца 1*

| Характарыстыка сітуацыйнай задачы "Хто ж смяецца апошнім?" | |
|---|---|
| Клас | 10 |
| Тэма | Камедыя "Хто смяецца апошнім" Кандрата Крапівы |
| Тып і від задання | Абагульняльнае (комплекснае, выніковае) |
| Віды функцыянальнай пісьменнасці. Фарміруемыя кампетэнцыі | *Галіновыя:* чытацкая, сацыякультурная, прававая, тэхналагічная, мастацка-эстэтычная.<br>*Універсальныя:* устойлівага асобаснага развіцця, мыслення, эмацыйнай рэгуляцыі, камунікацыі, кааперацыі, грамадзянскасці |
| Запланаваныя вынікі | *Асобасныя і метапрадметныя:* вучань транслюе пазітыўнае стаўленне да гуманістычных каштоўнасцяў, адлюстраваных у камедыі "Хто смяецца апошнім";<br>дэманструе каштоўнаснае стаўленне да культурнай спадчыны, нацыянальных традыцый краіны;<br>аналізуе мастацкі твор з пазіцыі асобасных адносін;<br>дэманструе ў працэсе аналізу высокі ўзровень самасвядомасці;<br>выбудоўвае асацыятыўныя, кантэкстуальныя характарыстыкі мастацкага вобразу, твору або эпохі;<br>супастаўляе сябе і іншых людзей з персанажамі мастацкіх твораў, самастойна фармулюе і выказвае эмацыйна-каштоўнаснае стаўленне да мастацкага твора;<br>узбагачае мастацкі твор новымі або дадатковымі сэнсамі;<br>ажыццяўляе пошук, адбор, аналіз, захаванне і апрацоўку мастацкай інфармацыі для рашэння вучэбных і жыццёвых задач;<br>фармулюе, аргументуе і адстойвае сваю пазіцыю ў адносінах да твора літаратуры; вызначае мэты і задачы ўласнай мастацка-творчай дзейнасці, ацэньвае яе вынік.<br>*Прадметныя:* вучань здольны акцэнтаваць увагу на настроі, мастацкіх сродках;<br>ведае ідэйны змест камедыі "*Хто смяецца апошнім*", яе праблематыку, сістэму вобразаў, сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці твораў, іх канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне |

## Сітуацыйная задача "Хто ж смяецца апошнім?"

*Сюжэт сітуацыі.* У сучасным свеце нам часта даводзіцца сутыкацца з сітуацыямі, калі трэба разабрацца, хто кажа праўду, а хто хоча спадабацца настаўніку, бацькам ці начальніку. Праблема несправядлівасці, ілжывых абвінавачванняў і барацьбы за аўтарытэт актуальная і сёння. У камедыі Кандрата Крапівы "*Хто смяецца апошнім*" паказана гісторыя, дзе інтрыгі, хлусня і навуковая некампетэнтнасць сутыкаюцца з сумленнасцю, прафесіяналізмам і мараллю. Вы — удзельнікі камісіі, якая павінна разабрацца, хто з персанажаў дзейнічае этычна і прафесійна, а хто ставіць асабістую выгаду вышэй за навуку і праўду.

**Заданне 1. Хто ёсць хто?**

На аснове тэксту п'есы вызначыце ролю асобных персанажаў (*іл. 1, 2*) у канфлікце. Запоўніце табліцу 2.

*Табліца 2*

| Персанаж | Роля ў канфлікце |
|---|---|
| Гарлахвацкі | |
| Чарнавус | |
| Зёлкін | |

**Заданне 2. Навука ці фарс?**

На аснове аналізу першага акта камедыі вызначыце, які падыход да навукі ў Чарнавуса, а які — у Гарлахвацкага (*іл. 3*). Аргументуйце адказ прыкладамі з тэксту, запоўніце табліцу 3.

*Табліца 3*

| Падыход да навукі | |
|---|---|
| Гарлахвацкага | Чарнавуса |
| | |

Абапіраючыся на тэкст п'есы і асабісты вопыт, вызначыце, чым навуковасць (*іл. 4*) адрозніваецца ад невуцтва (*іл. 5*). Запоўніце табліцу 4.

*Табліца 4*

| Крытэрыі | Навуковасць | Невуцтва |
|---|---|---|
| Метады даследавання | | |
| Доказы | | |
| Адносіны да крытыкі | | |
| Аб'ектыўнасць | | |



Ілюстрацыя 1. Вера і Чарнавус.



Ілюстрацыя 2. Гарлахвацкі і Зёлкін.



Ілюстрацыя 3. Чарнавус і Гарлахвацкі.



Ілюстрацыя 4. Чарнавус за сталом.

**Заданне 3. Грошы, што “не маюць гаспадара”.**

Прачытайце дыялог цёці Каці і Нічыпара *(іл. 6)*. Выпішыце выразы пра стаўленне да выдаткаў Гарлахвацкага. Як характарызуе гэта дырэктара інстытута? Якую з’яву крытыкуе аўтар?

“Цёця Каця выходзіць з дзвярэй дырэктаравага кабінета. За ёю Нічыпар.

Цёця Каця. Фу!.. Добра, што ты якраз падышоў, я ж бы адна гэтаму сталу і рады не дала.

Нічыпар. Гэта, брат, стол! Каб некалі мне такі пляц зямлі, то я б гаспадаром быў.

Цёця Каця. Новы поп, дык новае і маленне. У таго дырэктара, бывала, адзін столік, два крэслы і ўсё. А ў гэтага ж стол гэтакі, а на стале ж мартаплясаў усялякіх панастаўляна — таксама грошай каштуюць.

Нічыпар. А што яму — шкада казённых грошай? Не з свае ж кішэні плаціць” [6, с. 7].



Ілюстрацыя 5. Гарлахвацкі за трыбунай.



Ілюстрацыя 6. Цёця Каця і Нічыпар.

**Заданне 4. Права на абарону.**

**4.1.** Прачытайце фрагменты, дзе Зёлкін (*іл. 7*) і Гарлахвацкі распаўсюджваюць чуткі пра Чарнавуса і Тулягу, а таксама вытрымкі з заканадаўчых актаў. Ацаніце, ці законныя і ці этычныя такія паводзіны. Якія правы чалавека парушаюцца? Ці могуць такія дзеянні мець наступствы з пункта погляду сучаснага нацыянальнага заканадаўства?

*Фрагмент 1*

"Зёлкін (адзін, бярэ тэлефонную трубку). Пеця… ты яшчэ нічога не чуў пра нашага Чарнавуса? Амба… Яшчэ не, але сёння ці заўтра напэўна… Ага, пыталіся адраса. Гэта пакуль што паміж намі… бывай… (Набірае другі нумар.) Саша, гэта ты? Скажу табе навіну… Наш Чарнавус пляснуўся. Не, ён яшчэ на рабоце, але ужо усё роўна, як і там. Каб не ведаў, дык бы не гаварыў" [6, с. 17].

*Фрагмент 2*

"Гарлахвацкі. (Тэлефонны званок. Гарлахвацкі ў трубку.) Слухаю… Гарлахвацкі… Пра Чарнавуса? А хто гэта пытаецца… З геафака?.. Я вам нічога пэўнага не маю права сказаць… Зёлкін званіў?.. Ён мае нюх на такія справы… Пацікаўлюся… Гэта Зёлкін ведае лепш за мяне. Праверу… Бывайце. (Палажыўшы трубку.) Трэба падліць масла ў агонь. (Набірае нумар.) Выдавецтва? Хто пры тэлефоне?.. Перадайце трубку самому дырэктару. Драчык? Здароў, Ваня… Гарлахвацкі гаворыць… У цябе там у пакоі, здаецца, людзі ёсць… Папрасі ўсіх выйсці. Так, размова будзе сакрэтная. Гатова? Дык вось у чым справа… Вы, здаецца, друкуеце кніжку Чарнавуса? А ты ведаеш, што ён шкоднік? Так, мой супрацоўнік Зёлкін устанавіў, што кніга напісана па-шкодніцку…" [6, с. 23].

*Фрагмент 3*

"Гарлахвацкі. Я, Мікіта Сымонавіч, хацеў сказаць вам адну рэч, ды не ведаю, ці варта. Уласна кажучы, і гаварыць я не маю права.

Туляга (спужаны). Што-небудзь для мяне непрыемнае?

Гарлахвацкі. Не скажу, каб гэта было вельмі прыемна для вас.

Туляга (калоцячыся). Аляксандр Пятровіч, родненкі! Што ж такое?

Гарлахвацкі. Прыходзілі, пыталіся пра вас.

Туляга. Пра мяне?

Гарлахвацкі. Так. Кажуць, у вас працуе тут нейкі Туляга. Чалавек нявысветлены.

Туляга (са страхам). Нявысветлены?

Гарлахвацкі.Ці не вядзе ён, кажуць, тут якой-небудзь падрыўной работы і ці праўда гэта, што ён дзянікінскі палкоўнік?

Туляга.. Палкоўнік?

Гарлахвацкі. Так. І прозвішча палкоўніка называлі, але я забыўся.

Туляга. Не Падгаецкі?

Гарлахвацкі. Здаецца, Падгаецкі.

Туляга (хапаецца за галаву). Ай, ай […]" [6, с. 27].



*Ілюстрацыя 7. Зёлкін і Зіна Зёлкіна.*



*Ілюстрацыя 8. Гарлахвацкі і Туляга.*

*Фрагмент 4*

"Гарлахвацкі. Я вам нічога не гаварыў.

Зёлкін. Мне і гаварыць нічога не трэба, я і так усё ведаю. Я нават ведаю прычыны.

Гарлахвацкі. Якія ж прычыны?

Зёлкін. Брат за граніцай — раз. (Загінае палец.)

Гарлахвацкі. Брат?

Зёлкін. Так, родны брат.

Гарлахвацкі. А яшчэ што?

Зёлкін. Геалагічную здымку збіраецца рабіць у прыгранічным раёне — два. (Загінае другі палец.) Да брата цягне — разумееце?

Гарлахвацкі. Усё?

Зёлкін. Не, не ўсё. Кніга яго шкодніцкая — тры. (Загінае трэці палец.)

Гарлахвацкі. Якая кніга?

Зёлкін. А вось гэта, якую ён у выдавецтва здаў.

Гарлахвацкі. Чым яна шкодніцкая?

Зёлкін. Залежы фасфарытаў паказаны там, дзе іх вельмі мала, і не паказаны самыя багатыя. Хавае для некага — разумееце?

Гарлахвацкі. І вы можаце гэта даказаць?

Зёлкін. Няхай ён раней паспрабуе даказаць, што гэта няпраўда" [6, с. 19—20].

*Даведка 1.* Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь

Артыкул 28. Кожны мае права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго прыватнае жыццё, у тым ліку ад замаху на тайну яго карэспандэнцыі, тэлефонных і іншых паведамленняў, на яго гонар і годнасць.

Дзяржава стварае ўмовы для абароны персанальных даных і бяспекі асобы і грамадства пры іх выкарыстанні" [7].

*Даведка 2.* Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь

Артыкул 188. Паклёп

"Распаўсюджванне заведама непраўдзівых звестак, якія зневажаюць іншую асобу (паклёп), у публічным выступленні, або ў друкаваным творы ці творы, які публічна дэманструецца, або ў сродках масавай інфармацыі, або ў інфармацыі, размешчанай у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, іншай сетцы электрасувязі агульнага карыстання ці выдзеленай сетцы электрасувязі, або паклёп, які ўтрымлівае абвінавачанне ва ўчыненні цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства, — караюцца штрафам, або папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем свабоды на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін" [8].

*Даведка 3.* Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь

Артыкул 981. Падставы ўзнікнення правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці

"Прававая ахова аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці ўзнікае на падставе факта іх стварэння ці з прычыны прадастаўлення прававой аховы ўпаўнаважаным дзяржаўным органам у выпадках і ў парадку, прадугледжаных гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі" [9].

*Даведка 4.* Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь

Артыкул 201. Парушэнне аўтарскага права, сумежных правоў і права прамысловай уласнасці

"1. Разгалошванне без згоды аўтара або заяўніка сутнасці вынаходкі, карыснай мадэлі, прамысловага ўзору або іншага аб'екта права прамысловай уласнасці да афіцыйнай публікацыі звестак аб іх, учыненае на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, — караецца грамадскімі работамі, або штрафам, або папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў.

2. Незаконнае распаўсюджванне або іншае незаконнае выкарыстанне аб'ектаў аўтарскага права, сумежных правоў або аб'ектаў права прамысловай уласнасці, учыненыя на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне або звязаныя з атрыманнем даходу ў буйным памеры, — караюцца грамадскімі работамі, або штрафам, або абмежаваннем свабоды на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў" [8].

*Даведка 5.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях

Артыкул 10.15. Парушэнне аўтарскага права, сумежных правоў і права прамысловай уласнасці

"1. Разгалошванне без згоды аўтара або заяўніка сутнасці вынаходкі, карыснай мадэлі, прамысловага ўзору або іншага аб'екта права прамысловай уласнасці да афіцыйнай публікацыі звестак аб іх — цягне накладанне штрафу ў памеры ад дзесяці да трыццаці базавых велічынь […].

2. Незаконнае распаўсюджванне або іншае незаконнае выкарыстанне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці — цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад дзесяці да трыццаці базавых велічынь з канфіскацыяй прадмета адміністрацыйнага правапарушэння незалежна ад таго, у чыёй уласнасці ён знаходзіцца, або без канфіскацыі […]" [10].

**4.2.** Прачытайце фрагмент, дзе Гарлахвацкі прымушае Тулягу напісаць навуковую работу (*іл. 8*), і вытрымкі з заканадаўчых актаў. Звярніце ўвагу, як парушаюцца правы чалавека на інтэлектуальную маёмасць, як парушаецца аўтарскае права. Ці могуць такія дзеянні мець наступствы з пункта погляду сучаснага заканадаўства?

"Гарлахвацкі. Я хачу, каб вы працавалі пад маім непасрэдным наглядам.

Туляга. Што ж я буду рабіць пад вашым наглядам?

Гарлахвацкі. Мы з вамі будзем пісаць навуковую працу.

Туляга. Мы з вамі? Удвух?

Гарлахвацкі. Так. Вы напішаце, а я прачытаю, праверу. Пасля мы яе зачытаем на савеце, апублікуем.

Туляга. За нашымі подпісамі?

Гарлахвацкі. Не. Вы ж разумееце, што ставіць сваё прозвішча побач з вашым мне нязручна.

Туляга. Значыць, толькі за маім подпісам?

Гарлахвацкі. Не, толькі за маім.

Туляга. Значыць, напішу працу я, а яна будзе лічыцца вашай?

Гарлахвацкі. Гэта зусім не важна, чыёй яна будзе лічыцца. Важна тое, каб гэта праца не прапала для грамадства. Прозвішча ваша можа яе скампраметаваць.

Туляга. Ага, разумею… Толькі я хацеў запытацца ў вас, ці не будзе гэта… подласцю?" [6, с. 28].

**Заданне 5. Інструкцыя для дылетанта.**

Складзіце інструкцыю з пяці крокаў для Гарлахвацкага, як напісаць навуковую працу.

**Заданне 6. Чыя праўда — той і смяецца.**

Прачытайце фінал твора. Чаму камедыя мае такую назву? Хто "смяецца апошнім" і чаму? Знайдзіце ў тэксце п'есы 2—3 цытаты, што паказваюць маральную перавагу Чарнавуса і падзенне Гарлахвацкага.

## Прыкладныя адказы на заданні і рэкамендацыі па іх ацэньванні

**Заданне 1**

Прыкладны адказ:

| *Персанаж* | *Роля ў канфлікце* |
|---|---|
| Гарлахвацкі | крыніца інтрыгі |
| Чарнавус | сапраўдны вучоны, які дапамагае выкрыць невука |
| Зёлкін | падхалім і даносчык, які ініцыюе і падаграе канфлікт |

**Заданне 2**

Прыкладны адказ:

| *Падыход да навукі* | |
|---|---|
| *Гарлахвацкага* | *Чарнавуса* |
| імітуе працу, шукае спосабы не паказваць сваю працу | займаецца сапраўднай навукай, гатовы расказваць пра сваю працу праз артыкулы, кнігі, выступленні, сцвярджае сябе як вучоны |

Прыкладны адказ:

| *Крытэрыі* | *Навуковасць* | *Невуцтва* |
|---|---|---|
| Метады даследавання | назіранні, эксперыменты, праверка гіпотэз | вера, традыцыя, суб'ектыўныя меркаванні |
| Доказы | патрабуюцца аб'ектыўныя доказы | неправераныя сцвярджэнні |
| Адносіны да крытыкі | развіваецца праз крытыку і самакарэкцыю (новыя даследаванні могуць удакладніць папярэднія тэорыі) | адмаўляе любую крытыку (нават калі ёсць супярэчлівыя факты) |
| Аб'ектыўнасць | імкнецца да максімальнай аб'ектыўнасці, выключаючы асабістыя схільнасці | часта грунтуецца на суб'ектыўнасці і залежыць ад асабістага вопыту або вераванняў |

**Заданне 3**

Гарлахвацкі з'яўляецца фінансава безадказным чалавекам, які любіць камфорт. Крапіва крытыкуе марнатраўства.

**Заданне 4**

**4.1.** Зёлкін і Гарлахвацкі парушаюць закон, распаўсюджваючы чуткі без доказаў. Распаўсюджванне чутак парушае правы на рэпутацыю, гонар і годнасць. Дзеянні Зёлкіна і Гарлахвацкага трапляюць пад прыкметы такіх правапарушэнняў, як паклёп і абвінавачванне без доказаў. Сучаснае заканадаўства прадугледжвае адказнасць за падобныя дзеянні.

**4.2.** Гарлахвацкі бессаромна вырашае прысвоіць сабе навуковую работу Тулягі, што парушае яго аўтарскае права. Такія дзеянні могуць мець наступствы ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Сучаснаму вынаходніку можна параіць засведчыць права на сваю інтэлектуальную ўласнасць і звярнуцца да структур Нацыянальнай сістэмы аховы і кіравання інтэлектуальнай уласнасцю ў Рэспубліцы Беларусь.

**Заданне 5**

1. Вызначыць тэму.
2. Сабраць і прааналізаваць крыніцы.
3. Правесці даследаванне.
4. Апісаць вынікі.
5. Атрымаць рэцэнзію (водгук).

**Заданне 6**

Ідэя: перамога маральнасці і праўды. Апошнім смяецца той, на чыім баку праўда і справядлівасць.

Цытаты:

"Гарлахвацкі. Я дакажу, на што я здатны... Я ў гэтым манастыры так зблытаю карты, што свой свайго не пазнае" [6, с. 23].

"Вера. (Гарлахвацкаму). Вы лгун і падлец!" [6, с. 61].

"Чарнавус. Як бы вы мяне ні абзывалі, я вам не дазволю апашляць савецкую навуку" [6, с. 60].

"Чарнавус. Так, не дазволю. Я ёй (навуцы. — **Аўт.**) лепшыя гады свайго жыцця аддаў... і ніякія шарлатаны мяне не запужаюць" [6, с. 60].

"Чарнавус. *(устае)*. [...] Хоць нямнога зрабіць, але каштоўнага" [6, с. 26].

**Рэкамендацыі па ацэньванні**

Ацэнка правільнасці выканання заданняў:

**Заданне 1** — 1 бал: правільнае вызначэнне ролі ўсіх персанажаў, 0 балаў: няправільны адказ або яго адсутнасць.

**Заданне 2** — 2 балы: правільнае запаўненне дзвюх табліц; 1 бал: запаўненне табліц 1—2 з памылкамі ў кожнай; 0 балаў: няправільна выкананае заданне (больш памылак, чым на 1 бал) або адсутнасць адказу.

**Заданне 3** — 1 бал: дадзены правільныя адказы; 0 балаў: адказы няправільныя або адсутнасць адказу.

**Заданне 4** — 1 бал: дадзены правільны адказ, 0 балаў: адказы няправільныя або адсутнасць адказу.

**Заданне 5** — 2 балы: правільна складзена інструкцыя; 1 бал: часткова правільна складзена інструкцыя; 0 балаў: няправільна складзена інструкцыя або адсутнасць адказу.

**Заданне 6** — 2 балы: дадзены правільныя адказы, падмацаваныя цытатамі; 1 бал: дадзены часткова правільныя адказы, падмацаваныя цытатамі; 0 балаў: дадзены адказы, не падмацаваныя цытатамі або адказ адсутнічае.

Колькасць набраных балаў улічваецца пры выстаўленні бягучай адзнакі.

**Рэфлексія: ацэнка, самааналіз**

Абмеркаванне вынікаў у класе, выпраўленне памылак. Самаацэнка — вучні высвятляюць асновы сваіх ведаў і дзеянняў, прычыны няўдач і намячаюць шляхі іх ліквідацыі.

Выкарыстанне праектнай методыкі прадугледжвае самастойную дзейнасць навучэнцаў па стварэнні канчатковага прадукту, дае ім магчымасць развіваць пазнавальныя здольнасці на аснове прадметных ведаў, фарміраваць універсальныя кампетэнцыі ў кантэксце як самастойнай, так і каманднай дзейнасці па пошуку і аналізе новай інфармацыі і вырашэнні практыка-арыентаваных задач.

---

1. Национальная стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2030 года // Информационно-поисковая система "ЭТАЛОН-ONLINE". — URL: https://etalonline.by/document/?regnum=u01704150&q_id=&ysclid=mlnzu8orqs380724844 (дата обращения: 15.02.2026).

2. О Концепции развития системы образования Республики Беларусь до 2030 года: постановление Совета Министров Республики Беларусь 30 ноября 2021 г. № 683 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — URL: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=c22100683 (дата обращения: 15.02.2026).

3. Национальная рамка универсальных компетенций обучающихся: основные термины и понятия / О. В. Зеленко, В. Ф. Русецкий, В. Г. Стуканов и [др.] // Веснік адукацыі. — 2025. — № 3. — С. 6—13.

4. Новые педагогические и информационные технологии в системе образования / Е. С. Полат, М. Ю. Бухаркина, М. В. Моисеева, А. В. Петров ; под ред. Е. С. Полат. — Москва : Издательский центр "Академия", 2002. — 272 с.

5. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура" для X—XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (базавы ўзровень) // Нацыянальны адукацыйны партал. — URL: https://adu.by/images/2025/08/Uchebnye_programmy/Uch-pr-Bel-lit-10-11-baz-uroven-2025.pdf?ysclid=mlo9fpea8g470762517 (дата звароту: 15.02.2026).

6. Крапіва, К. Хто смяецца апошнім / К. Крапіва // Збор твораў : у 6 т. / К. Крапіва. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003 — Т. 4. — С. 6—63.

7. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (са зменамі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада 1996 г., 17 кастрычніка 2004 г. і 27 лютага 2022 г.) // Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. — URL: https://president.gov.by/be/gosudarstvo/constitutionhttps://president.gov.by/be/gosudarstvo/constitution (дата звароту: 15.02.2026).

8. Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь: 9 ліпеня 1999 г. № 275-З (у актуальнай рэдакцыі) // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — URL: https://pravo.by/document/pdf/kodeksibel/kriminalni_kodeks_rb_1999_bel (дата звароту:15.02.2026).

9. Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь: 7 снежня 1998 г. № 218-З (у актуальнай рэдакцыі) // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — URL: https://pravo.by/document/pdf/kodeksibel/gramadzjanskij_kodeks_rb_1998_bel (дата звароту: 15.02.2026).

10. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях: 6 студзеня 2021 г. № 91-З (у актуальнай рэдакцыі) // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — URL: https://pravo.by/document/pdf/kodeksibel/koap_rb_bel_2021 (дата звароту: 15.02.2026).

*У якасці ілюстрацыйнага матэрыялу выкарыстаны кадры з фільма "Хто смяецца апошнім" (1954). Крыніца: https://www.youtube.com/watch?v=ymBtwAhAI_0.*

*Паступіў у рэдакцыю 19.02.2026.*

## ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

У 2025 г. рэдакцыяй часопіса быў абвешчаны конкурс "Штучны інтэлект у навучанні гісторыі: мой урок будучыні". Прыемна адзначыць высокую цікавасць настаўнікаў гісторыі да ўдзелу ў гэтым мерапрыемстве. Мы атрымалі больш за 20 метадычных распрацовак урокаў, пазакласных мерапрыемстваў і іншых дыдактычных матэрыялаў. Журы конкурсу — чальцы рэдакцыйнай калегіі і рады — спецыялісты ў галіне дыдактыкі і методыкі выкладання гісторыі — разам з экспертамі ў галіне штучнага інтэлекту ў адукацыі падвялі яго вынікі.

У намінацыі **"Тэарэтычнае асэнсаванне штучнага інтэлекту ў навучанні гісторыі"** дыпломамі ўзнагароджваюцца:

**Аляксандр КОРЗЮК**

за артыкул "Использование искусственного интеллекта в историческом образовании США: методические принципы и рекомендации" (№ 1/2026);

**Вольга СТРАЛОВА**

за артыкул "Искусственный интеллект входит в историю: размышления о возможностях искусственного интеллекта в школьных курсах истории и обществоведения" (№ 4/2025);

**Сяргей ШУПЛЯК**

за артыкул "Искусственный интеллект в процессе обучения истории: подходы к решению проблем заимствования" (№ 6/2025).

У намінацыі **"Метадычная распрацоўка ўрока"** ўзнагароджваюцца:

**дыпломам II ступені — Дар'я ЛАЎШУК**

за сцэнарый урока "Феодальный строй в Западной Европе в X—XIII вв." (всемирная история, VI класс) (№ 2/2026);

**дыпломам удзельніка — Андрэй КАЗАК**

за артыкул "Использование нейросетей на уроках истории для развития читательской грамотности учащихся" (№ 2/2026).

У намінацыі **"Сцэнарый пазакласнага мерапрыемства"** ўзнагароджваюцца:

**дыпломам II ступені — Віталій ЙОЦЮС, Ганна БУСЕНЬ**

за артыкул "Фарміраванне чытацкай пісьменнасці праз АІ-праект "Архітэктурны дыялог: ад Візантыі да Полацка" (сцэнарый пазакласнага мерапрыемства для вучняў VIII класа)" (№ 1/2026);

**дыпломамі III ступені — Марына БЕЛАХВОСТАВА, Аляксандра МАЛЯВАНКІНА**

за артыкул "Возможности использования нейронных сетей для реконструкции исторических событий" (№ 1/2025);

**Святлана ВАРЫКАВА**

за артыкул "Использование средств искусственного интеллекта для обработки краеведческого материала по теме "Великая Отечественная война" (№ 2/2026).

Дыпломы будуць уручаны на працягу сакавіка — красавіка 2026 г. або дасланыя па пошце.

***Віншуем пераможцаў і жадаем далейшых прафесійных і творчых поспехаў!***